***Чараўко В.У.*** *(г. Полацк)*

# ПАЧАТАК ВЫВУЧЭННЯ ПОЗНЕСЯРЭДНЕВЯКОВЫХ ПАХАВАЛЬНЫХ ПОМНІКАЎ ПАДЗВІННЯ Ў КАНТЭКСЦЕ АГУЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ВЕДАЎ НА БЕЛАРУСІ[1]

Сістэматычныя даследаванні пахаванняў у краінах Заходняй Еўропы і ЗША пачаліся ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. [4, с. 6]. Аб першых аматарскіх «раскопках» пахавальнага помніка на тэрыторыі Беларускага Падзвіння (і ўвогуле аб першых раскопках на Беларусі) гэтага перыяду згадваецца і ў Беларускім навуковым асяроддзі [1, с. 16; 5, с. 232].

У час земляных работ у маёнтку Мосар (зараз вёска ў Глыбоцкім раёне) сяляне выпадкова раскапалі старадаўняе пахаванне [1, с. 16]. Уладальнікам маёнтка з'яўляўся чашнік ВКЛ *Роберт Бжастоўскі*, які ведаў аб інтарэсе вялікага князя літоўскага і караля польскага Станіслава Аўгуста Панятоўскага да такіх выпадкаў. Таму ў 1790 г. ён даслаў манарху некаторыя знойдзеныя ў пахаванні артэфакты [17, k. 285–287]. Станіслаў Аўгуст зацікавіўся паведамленнем і прасіў даць больш падрабязныя звесткі. Яго пытанні былі сфармуляваны ў выглядзе анкеты з пяці пунктаў і сталі першым кіраўніцтвам па правядзенні раскопак [5, с. 232]. У лісце манарх пытаўся пра наяўнасць труны, вопраткі, прасіў паведаміць пол памерлага, глыбіню размяшчэння пахавання і ўдакладніць, ці захавалася ад цела што-небудзь, акрамя касцей. Таксама Станіслаў Аўгуст цікавіўся, ці не знойдзена на парэштках або каля іх яшчэ нейкіх рэчаў [17, k. 285–287].

Р. Бжастоўскі здолеў адказаць на пастаўленыя пытанні. Прыцягнуўшы сялян, ён правёў паўторныя, на гэты раз мэтанакіраваныя раскопкі. Аб іх маштабе сведчыць тое, што некаторыя рэчы былі выяўлены на адлегласці каля 20 локцяў ад пахавання. Знойдзенае было пераслана манарху [17, k. 288–289]. Звяртае ўвагу як слушнасць пытанняў манарха з пазіцый нават сучаснай археалогіі, так і тое, што Р. Бжастоўскі першапачаткова не палічыў патрэбным даць у сваім лісце падрабязнае апісанне знойдзеных касцяка і рэчаў. Прычыну розніцы ў падыходах варта шукаць у атрыманай Станіславам Аўгустам выдатнай адукацыі [3, с. 625]. За клопаты Р. Бжастоўскі атрымаў ордэн Святога Станіслава, якім у Рэчы Паспалітай узнагароджвалі за цывільныя заслугі [14, с. 377; 17, k. 288].

[1] Работа выканана ў межах Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гг. (падпраграма 12.1. «Гісторыя і культура», заданне 1.1.01. «Беларускія землі ў першабытную эпоху, сярэднявечча і ранні новы час: археалагічныя помнікі, тэрыторыя, насельніцтва, эканоміка і культура», навукова-даследчая работа «Насельніцтва Полацкага Падзвіння ў I–II тыс. н. э.»).

У апошняй чвэрці XVIII ст. беларускія землі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі. Падзелы Рэчы Паспалітай абудзілі цікавасць да мінулага і старажытнасцей ў польскім грамадстве [1, с. 21]. У перыяд напалеонаўскіх войнаў, асабліва пасля 1812 г., рэзка ўзрос інтарэс да гісторыі ў асяроддзі рускай інтэлігенцыі [1, с. 20, 23; 16, с. 42]. Гэтыя перадумовы спрыялі вывучэнню археалагічных помнікаў як мясцовымі памешчыкамі, так і аматарамі з ліку чыноўнікаў і афіцэраў. У 1810 г. у сваім маёнтку Шаўры Лідскага павета першыя раскопкі курганоў з навуковымі мэтамі правёў Тэадор Нарбут [1, с. 21–22; 2, с. 11].

У першай трэці XIX ст. цікавасць да помнікаў Беларусі праяўлялі асобныя энтузіясты і мецэнаты [1, с. 24, 60]. Абмеркаванне знаходак, абмен інфармацыяй і вопытам паміж імі калі і адбываліся, то праз асабістае ліставанне. Матэрыялы і вынікі такіх навуковых пошукаў працяглы час заставаліся вядомымі толькі самім даследчыкам [15, с. 190–191]. У асобных выпадках звесткі аб пошуках старажытнасцей траплялі на старонкі газет і часопісаў і станавіліся вядомымі грамадскасці.

Прыкметную ролю ў збіранні і вывучэнні старадаўніх рукапісаў і рэчаў у пачатку XIX ст. адыгрываў Мікалай Пятровіч Румянцаў (1754–1826). Саноўнік і прадстаўнік вышэйшай расійскай арыстакратыі, граф Румянцаў пасля выхаду ў адстаўку заняўся гістарычнымі даследаваннямі. Вакол яго склаўся гурток даследчыкаў-энтузіястаў і сетка мясцовых карэспандэнтаў. Асаблівую ўвагу М.П. Румянцаў праяўляў да тэрыторыі Беларусі, дзе знаходзілася яго асноўнае ўладанне – Гомель [1, с. 25]. Там намаганнямі графа і яго гуртка былі створаны археалагічная калекцыя і багаты кнігазбор [7, с. 25–26]. З дзейнасцю сяброў гуртка звязаны першыя звесткі аб позднесярэдневяковых помніках Беларускага Падзвіння – каменных крыжах у ваколіцах Полацка.

У 1818 г. «Паўночная пошта, або Новая Санкт-Пецярбургская газета» апублікавала заметку аб Рагвалодавым камені ў ваколіцах Оршы, які па просьбе М.П. Румянцава адшукаў і апісаў віцэ-рэктар езуіцкага калегіума Дэзідэрый Рышардот [1, с. 29]. Заметка выклікала цікавасць у інтэнданта I Арміі генерал-лейтэнанта *Ягора Францавіча Канкрына* (1774–1845) – будучага міністра фінансаў [1, с. 30–31]. Ён правёў пошукі Барысавых камянёў, прыцягнуўшы да гэтага падначаленых, і ўдакладніў звесткі аб Рагвалодавым камяні. Вынікі пошукаў ён апісаў у лістах да М.П. Румянцава і часткова апублікаваў у «Паўночнай пошце». Да аднаго з лістоў Я.Ф. Канкрын прыклаў копію рапарта наглядчыка правіянцкай крамы ў Полацку Рэпіна ад 13 снежня 1818 г. Рэпін паведамляў, што разам з архімандрытам базыльянскага Барысаглебскага манастыра Іаілем Шулакевічам ён аглядаў каменныя крыжы ў маёнтку памешчыка Абрампальскага Бяздзедавічы і ў Экімані каля Полацка [1, с. 26, 30–39]. Гэта паведамленне аб каменных крыжах (без іх апісання) з'яўляецца першай вядомай згадкай аб позднесярэдневяковых пахавальных помніках Беларускага Падзвіння ў прыватнай карэспандэнцыі.

Першая ж іх згадка ў навуковай публікацыі звязана з імем *Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага* (1784–1825), які зрабіў сваё назіранне практычна адначасова з Канкрынам. З. Даленга-Хадакоўскі шмат падарожнічаў па тэрыторыі сучасных Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, дзе фіксаваў тапанімію, збіраў фальклор, займаўся раскопкамі, картаграфаваннем археалагічных помнікаў [1, с. 44–45; 11, с. 197]. Асаблівую цікавасць у яго выклікалі гарадзішчы. Яшчэ не разумеючы працэс утварэння культурнага слоя, З. Даленга-Хадакоўскі ўспрымаў іх як штучна насыпаныя з чарназёму ўзвышшы і інтэрпрэтаваў як рэшткі язычніцкіх свяцілішчаў [7, с. 30]. Адзначаючы наяўнасць гарадзішчаў ва ўсіх старажытных славянскіх паселішчах, даследчык мімаходзь згадаў, што цяпер на гарадзішчы Полацка знаходзяцца могілкі [13, с. 30–31].

Паведамленне аб гэтым змяшчаецца ў «Данясенні аб першых поспехах падарожжа ў Расіі», падрыхтаваным З. Даленга-Хадакоўскім у 1822 г. Але апублікавана «Данясенне…» было толькі ў 1844 г., ужо пасля смерці аўтара [13]. Можна меркаваць, што назіранне зроблена ў 1819 г., калі даследчык накіроўваўся з Гомеля, дзе ён шукаў у М.П. Румянцава падтрымкі сваіх даследаванняў, у Пецярбург [12, с. 18]. Археалагічныя раскопкі могілак на полацкім гарадзішчы, праведзеныя Д.У. Дукам у 2007 г. і М.В. Клімавым у 2009 г., дазволілі датаваць выяўленыя пахаванні XVII–XVIII стст. [6, с. 62–70; 10, с. 29].

З. Даленга-Хадакоўскі адзначыў і такі тып пахавальных помнікаў, як жальнікі. Распавядаючы аб уласным досведзе іх раскопак у Ладажскім павеце, ён засяродзіў увагу, што жальнікі сустракаюцца ў тым ліку і ў «Сенскім павеце Белай Русі» (маецца на ўвазе Сенненскі павет Віцебскай губерні). Жальнікамі даследчык называў «старажытныя могілкі, пакінутыя пагосты, дзе таксама хавалі нябожчыкаў, і наогул малыя магілы мірных жыхароў» [13, с. 376]. Аб каменных абкладках, валунах, каменных крыжах як прыкметах жальнікаў ён не казаў. Выклікае ўвагу падыход З. Даленгі-Хадакоўскага да інтэрпрэтацыі жальнікаў. Ён катэгарычна не згаджаўся з тымі, хто «без усялякіх даследаванняў лічаць наўздагад, што гэтыя жальнікі... паходзяць з часоў літоўскіх ліхадзействаў і нападаў» [13, с. 377–378]. З. Даленга-Хадакоўскі з іроніяй заўважыў: «Я яшчэ раз скажу, што зручней за ўсе даследаванні можна судзіць у палацах і пакоях. Шкада толькі, што ў прасторы і нетрах зямлі нашай не тое адкрываецца» [13, с. 377–378]. Гэта выказванне паказвае разуменне дзеячам вялікага патэнцыялу археалагічных крыніц.

Пры раскопках даследчык апісваў структуру помніка і ўсе знаходкі. Ён браў для захавання не толькі масавы матэрыял, але нават косткі, што з'яўляецца прыкладам надзвычайнай скрупулёзнасці [9, с. 229]. Але археалагічных раскопак познесярэдневяковых пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння З. Даленга-Хадакоўскі не праводзіў і ўвогуле больш абагульняў археалагічныя матэрыялы, чым непасрэдна здабываў іх [7, с. 34].

У 1821 г. Полацк па даручэнні П.М. Румянцава наведаў сябра яго гуртка, паштовы чыноўнік і будучы акадэмік Пётр Іванавіч Кёпен [1, с. 39–41]. Ён

планаваў сустрэцца з архімандрытам І. Шулакевічам, але не застаў таго на месцы. Дазнаўшыся, што І. Шулакевіч нядаўна ездзіў у маёнтак Бяздзедавічы замалёўваць «нейкі надпіс на камяні», П.І. Кёпен таксама выправіўся туды. Ён меркаваў знайсці адзін з Барысавых камянёў, але з расчараваннем убачыў «толькі каменны гранітавы крыж з надпісам» (той самы, аб якім П.М. Румянцаву ў 1818 г. паведамляў Я.Ф. Канкрын) [1, с. 26]. Характарыстыка каменнага крыжа як «звычайнага надмагільнага» [8, с. 104] ускосна сведчыць аб тым, што П.І. Кёпен раней неаднаразова бачыў падобныя надмагіллі. Даследчык замаляваў крыж і паспрабаваў прачытаць надпіс. Паводле яго прачытання, надпіс змяшчаў дату: 1650 г. [1, с. 26; 8, с. 103–104].

Такім чынам, у канцы XVIII – пачатку XIX ст. на Беларусі былі зроблены першыя крокі ў навуковым вывучэнні археалагічных помнікаў. Яны ўвасобіліся ў зборы інфармацыі аб некаторых помніках, іх апісанні, невялікіх раскопках, публікацыі матэрыялаў даследаванняў. Збор інфармацыі аб помніках не насіў сістэмнага і масавага характару і ажыццяўляўся сіламі даследчыкаў-аматараў. Камунікацыя паміж даследчыкамі адбывалася шляхам асабістага ліставання і не была абавязковай (сябра румянцаўскага гуртка П.І. Кёпен, які ў 1821 г. апісваў каменны крыж у маёнтку Бяздзедавічы, не ведаў пра аналагічнае паведамленне, дасланае М.П. Румянцаву ў 1818 г. Я.Ф. Канкрыным). Інфармацыя аб старажытнасцях рэдка і са спазненнем трапляла на старонкі перыядычных выданняў (падрыхтаваная З. Даленга-Хадакоўскім у 1822 г. справаздача апублікавана ў 1846 г.).

Пошук і вывучэнне старажытнасцей не былі для даследчыкаў-аматараў асноўнай дзейнасцю: гэтым займаліся на ўласныя сродкі альбо пры падтрымцы мецэнатаў пасля выхаду ў адстаўку або ў вольны ад вайсковай ці грамадзянскай службы час. Вывучэнне старажытнасцей можа разглядацца як уласцівая інтэлектуалам пачатку XIX ст. форма баўлення часу. У ліку выяўленых, апісаных і раскапаных у гэты перыяд аб'ектаў былі асобныя познесярэдневяковыя пахавальныя помнікі Беларускага Падзвіння. Першай вядомай згадкай аб іх у прыватнай карэспандэнцыі з'яўляецца паведамленне Я.Ф. Канкрына аб каменных крыжах у ваколіцах Полацка (1818). Першая згадка познесярэдневяковага могільніка ў навуковай публікацыі належыць З. Даленга-Хадакоўскаму.

ЛІТАРАТУРА

1. **Алексеев, Л. В.** Археология и краеведение Беларуси : XVI в. – 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев ; под ред. Б. А. Рыбакова. – Мінск : Беларус. навука, 1996. – 206 с.

2. **Алексеев, Л. В.** Полоцкая земля в IX–XIII вв. : очерки истории Северной Белоруссии / Л. В. Алексеев. – М. : Наука, 1966. – 295 с. : ил.

3. **Грыцкевіч, А.** Станіслаў Аўгуст / А. Грыцкевіч // Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : [у 3 т.] / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2005–2010. – Т. 2 : Кадэцкі корпус – Яцкевіч. – 2006. – С. 625–626.

4. **Гуляев, В. И.** Изучение погребального обряда в зарубежной археологии / В. И. Гуляев // Краткие сообщения института археологии РАН. – 2010. – Вып. 224. – С. 5–19.

5. **Добриян, А. А.** Развитие методики археологических раскопок в Беларуси в XVIII – начале XX века / А. А. Добриян // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2006. – № 12. – С. 232–237. – (Археалогія эпохі Сярэдневякоўя. Да 75-годдзя з дня нараджэння П. Ф. Лысенкі).

6. **Дук, Д. У.** Могілкі полацкага гарадзішча (па выніках археалагічных раскопак у 2007 г.) / Д. У. Дук, В. А. Емяльянчык // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2011. – Вып. 21. – С. 61–73.

7. **Каханоўскі, Г. А.** Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г. А. Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 118 с. : іл.

8. **Кеппен, П.** Список русским памятникам, служащим к составлению истории художественной и отечественной палеографии / П. Кеппен. – М. : Тип. С. Селивановского, 1822. – С. А–К + VIII с. + 119 с.

9. **Клейн, Л. С.** История археологической мысли : в 2 т. / Л. С. Клейн. – СПб. : Изд-во С.-Петерб. ун-та, 2011. – Т. 1. – 688 с. : ил.

10. **Клімаў, М. В.** Археалагічныя даследаванні гарадзішча і Вялікага пасада Полацка ў 2009 г. / М. В. Клімаў // Середньовічні міста Полісся : тези доповідей міжнар. наук. арх. конф. – Кіїв : Олевьск, 2011. – С. 29–31.

11. **Малаш, Л.** Даленга-Хадакоўскі Зарыян / Л. Малаш // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. В. Біч [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993–2003. – Т. 3 : Гімназіі – Кадэнцыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – 1996. – С. 196–197.

12. **Малаш, Л.** Піянер славяназнаўства / Л. Малаш // Выбранае / З. Далэнга-Хадакоўскі. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – С. 5–36.

13. **Русский** исторический сборник, издаваемый императорским Обществом истории и древностей российских : [в 7 т.] / ред. Погодин. – М. : В Университетской тип., 1837–1844. – Т. 7. – 1844. – 378 с.

14. **Сінчук, І.** Ордэны / І. Сінчук // Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : [у 3 т.] / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2005–2010. – Т. 2 : Кадэцкі корпус – Яцкевіч. – 2006. – С. 377–378.

15. **Стёпин, В. С.** История и философия науки : учебник для аспирантов и соиск. учён. степени канд. наук / В. С. Стёпин. – М. : Академ. проект : Трикста, 2011. – 423 с.

16. **Формозов, А. А.** Очерки по истории русской археологии / А. А. Формозов. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1961. – 128 с.

17. **Mienicki, W.** Wykopalisko w Mosarzu w koccu XVIII stulecia, przyczynek do archeologii krajowej [Электронны рэсурс] / W. Mienicki // Wiadomoşci numizmatyczno-archeologiczne. – 1892. – № 1/2 (11/12). – К. 286–289. – Рэжым доступу: http://www.mbc.malopolska.pl/dlibra/info?forceRequestHandlerId=true&mimetype=image/x.djvu&sec=false&handler=djvu_html5&content_url=/Content/18344/index.djvu. – Дата доступу: 06.01.2018.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА
«ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У.І. ЛЕНІНА»
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ П.М. МАШЭРАВА»
КАФЕДРА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

# ВІЦЕБСКІ КРАЙ

Т. 4

*Матэрыялы IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскі край», прысвечанай 80-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці*

22 лістапада 2018 г., Віцебск

Мінск 2019

УДК 947(Р476.5)
ББК 63.3(4 Беи-Вит)5
В54

Рэцэнзенты:

**В. І. Вовк**, кандыдат гістарычных навук, намеснік дырэктара Цэнтра краязнаўства імя акадэміка П. Ц. Транько Харкаўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя В. Н. Каразіна

**А. М. Дулаў**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі Установы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава»

**В. М. Хаданёнак**, кандыдат гістарычных навук, прарэктар па выхаваўчай рабоце Установы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт»

Рэдакцыйная калегія:

Т. М. Адамян (гал. рэд.), В. М. Камендантава, Л. І. Рагачова, В. М. Аўсяннікава, А. М. Васілеўская, А. В. Ігнаценка, Н. А. Пугачова, Н. В. Фенчанка

**Віцебскі** край : матэрыялы IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскі край», прысвечанай 80-годдзю ўтварэння
В54 Віцебскай вобласці, 22 лістапада 2018 г., Віцебск / Дзяржаўная ўстанова «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава», Кафедра гісторыі Беларусі ; рэдкал.: Т. М. Адамян (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2019. – Т. 4. – 346, [1] с.
ISBN 978-985-7125-58-6

У т. 4 штогадовага выдання «Віцебскі край» увайшлі матэрыялы IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскі край», прысвечанай 80-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці, якая адбылася 22 лістапада 2018 г. у Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна.

Выданне адрасавана гісторыкам, музейным супрацоўнікам, архівістам, краязнаўцам, бібліятэкарам, педагогам, усім, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю.

**УДК 947(Р476.5)**
**ББК 63.3(4Беи-Вит)5**

**ISBN 978-985-7125-58-6**

© Дзяржаўная ўстанова «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна», 2019
© Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», 2019

# ЗВЕСТКІ ПРА АЎТАРАЎ

| | |
|---|---|
| Аляксеева<br>Таццяна Уладзіміраўна | Выхавальнік сярэдняй школы № 44 г. Віцебска |
| Андрэйчык<br>Кацярына Віктараўна | Старшы выкладчык кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта |
| Арлова<br>Ала Генадзеўна | Краязнавец (г. п. Бешанковічы) |
| Бараноўскі<br>Аляксандр Віктаравіч | Аспірант Інстытута гісторыі НАН Беларусі, магістр гіст. навук |
| Бараноўскі<br>Андрэй Леанідавіч | Галоўны бібліёграф навукова-даследчага аддзела бібліяграфіі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі |
| Бароўка<br>Ванда Юльянаўна | Прафесар кафедры літаратуры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, д. філал. н., прафесар |
| Бондарава<br>Алена Міхайлаўна | Вядучы архівіст аддзела інфармацыйна-пошукавых сістэм і аўтаматызаваных архіўных тэхналогій Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці |
| Воднева<br>Ірына Пятроўна | Загадчык Краязнаўчага музея г. Полацка, філіяла НПГКМЗ |
| Гайдукоў<br>Канстанцін Пятровіч | Настаўнік замежных моў Выдрэйскай я/с базавай школы Лёзненскага раёна |
| Ганчарова<br>Іна Уладзіміраўна | Загадчык сектара навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі |
| Гладкова<br>Ганна Аляксандраўна | Дацэнт кафедры літаратуры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, к. філал. н., дацэнт |
| Давідоўская<br>Вольга Мікалаеўна | Галоўны захавальнік фондаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея |
| Дадэркіна<br>Жанна Віктараўна | Настаўнік беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 12 г. Віцебска |
| Дзянісава<br>Іаланта Васільеўна | Старшы выкладчык кафедры музыкі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, магістр пед. навук |
| Дубоўская<br>Таццяна Аляксандраўна | Карэктар рэдакцыі газеты «Мы і час» Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, к. філал. н. |
| Дулава<br>Юлія Уладзіміраўна | Аспірант кафедры агульнага і рускага мовазнаўства Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава |

| | |
|---|---|
| Ермалёнак<br>Вітольд Антонавіч | Настаўнік гісторыі, кіраўнік музейнага аб'яднання Міёрскай сярэдняй школы № 3 імя Героя Савецкага Саюза Ягора Андрэевіча Томкі |
| Жукоўскі<br>Віктар Васільевіч | Настаўнік геаграфіі сярэдняй школы № 2 г. Оршы |
| Іванова<br>Таццяна Пятроўна | Дацэнт кафедры правазнаўства і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Віцебскага філіяла УА ФПБ «Міжнародны ўніверсітэт "МИТСО"», к. г. н., дацэнт |
| Казлова<br>Алена Уладзіміраўна | Намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Полацкай дзяржаўнай гімназіі № 1 імя Францыска Скарыны |
| Карпекін<br>Канстанцін Рыгоравіч | Галоўны захавальнік фондаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, к. г. н. |
| Кепін<br>Дзмітрый Уладзіміравіч | Малодшы навуковы супрацоўнік аддзела музеялогіі і навукова-тэхнічнай інфармацыі Нацыянальнага навукова-прыродазнаўчага музея НАН Украіны, к. г. н. (г. Кіеў, Украіна) |
| Леаненка<br>Станіслаў Пятровіч | Выхавальнік Бешанковіцкай гімназіі-інтэрната, краязнавец |
| Лісаў<br>Аляксандр Генадзевіч | Дацэнт кафедры філасофіі і паліталогіі Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны, к. мастацтвазнаўства, дацэнт |
| Лук'янава<br>Валерыя Андрэеўна | Настаўнік гісторыі і грамадазнаўства гімназіі № 2 г. Віцебска |
| Ляшчынскі<br>Міхаіл Аляксандравіч | Намеснік старшыні Віцебскага абласнога савета ветэранаў |
| Макараў<br>Максім Дзмітрыевіч | Старшы навуковы супрацоўнік РІУП «Навукова-тэхналагічны парк БНТУ "Політэхнік"», к. г. н. |
| Мандрык<br>Іван Уладзіміравіч | Прафесар кафедры гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, д. г. н., прафесар |
| Марціновіч<br>Сяргей Віктаравіч | Галоўны захавальнік фондаў Віцебскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея, магістр пед. навук |
| Мізярска<br>Наталля Аляксандраўна | Аспірант гістарычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, магістр гіст. навук |
| Мухіна<br>Надзея Аляксандраўна | Метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі |
| Навасельцава<br>Ганна Віктараўна | Дацэнт кафедры літаратуры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, к. філал. н., дацэнт |

| | |
|---|---|
| Навумава<br>Наталля Міхайлаўна | Намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Полацкай дзяржаўнай гімназіі № 1 імя Францыска Скарыны |
| Налётава<br>Наталля Мікалаеўна | Аспірант кафедры літаратуры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, магістр філал. н. |
| Нікалаева<br>Ірына Уладзіміраўна | Загадчык кафедры агульнай гісторыі і сусветнай культуры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, к. г. н., дацэнт |
| Нікіцін<br>Станіслаў Пятровіч | Захавальнік музейных каштоўнасцей народнага музея «Гісторыя Заронаўскага краю», краязнавец |
| Нікіціна<br>Людміла Канстанцінаўна | Захавальнік музейных каштоўнасцей народнага музея «Гісторыя Заронаўскага краю», краязнавец |
| Новак<br>Галіна Рыгораўна | Педагог дадатковай адукацыі Віцебскага гарадскога цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі |
| Падліпскі<br>Аркадзь Міхайлавіч | Краязнавец |
| Піваваp<br>Мікалай Васільевіч | Настаўнік гісторыі Віцебскага кадэцкага вучылішча, к. г. н., дацэнт |
| Пірагова<br>Вольга Уладзіміраўна | Малодшы навуковы супрацоўнік навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі |
| Рабушка<br>Марына Віктараўна | Метадыст аддзела спорту, турызму і краязнаўства Віцебскага гарадскога цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі |
| Русецкі<br>Аркадзь Уладзіміравіч | Прафесар кафедры агульнай гісторыі і сусветнай культуры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, д. г. н., прафесар |
| Русецкі<br>Юрый Аркадзевіч | Дырэктар Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, к. г. н., дацэнт |
| Салаўянаў<br>Андрэй Пятровіч | Вучоны сакратар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, к. г. н., дацэнт |
| Саматой<br>Ірына Вацлаваўна | Незалежны даследчык |
| Смірнова<br>Таццяна Рафаілаўна | Вядучы навуковы супрацоўнік Дзіцячага музея г. Полацка, філіяла НПГКМЗ |
| Струнчанка<br>Андрэй Андрэевіч | Намеснік дырэктара па аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці, магістр гіст. навук |

| | |
|---|---|
| Стук<br>Павел Сяргеевіч | Магістрант гістарычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава |
| Сцебурака<br>Анатоль Мікалаевіч | Загадчык навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, к. г. н. |
| Тачыла<br>Наталля Рыгораўна | Аспірант кафедры беларускай і рускай філалогіі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя І.П. Шамякіна |
| Трусава<br>Алена Рыгораўна | Незалежны даследчык |
| Уліновіч<br>Надзея Васільеўна | Вядучы метадыст па этнаграфіі і фальклоры Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці |
| Фядотава-Шнэр<br>Наталля Алегаўна | Вядучы архівіст Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, магістр пед. навук |
| Цецераў<br>Віктар Аляксеевіч | Магістрант гістарычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава |
| Цімафееў<br>Расціслаў Уладзіміравіч | Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, к. г. н., дацэнт |
| Цітова<br>Алена Мікалаеўна | Дырэктар Цэнтра помніказнаўства НАН Украіны і Украінскага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, к. г. н., дацэнт (г. Кіеў, Украіна) |
| Чараўко<br>Віктар Уладзіміравіч | Старшы выкладчык кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта |
| Шышанаў<br>Валерый Аляксеевіч | Намеснік дырэктара па навуковай рабоце Віцебскага абласнога краязнаўчага музея |
| Юпатаў<br>Антон Нікіфаравіч | Вядучы архівіст Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці |
| Юрчак<br>Дзяніс Валер’евіч | Галоўны спецыяліст Упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама, к. г. н., дацэнт |
| Янкул<br>Аляксей Мікалаевіч | Аспірант кафедры гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археалогіі гістарычнага факультэта Харкаўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя В.Н. Каразіна (г. Харкаў, Украіна) |
| Ястрэмскі<br>Павел Генадзевіч | Настаўнік сярэдняй школы № 12 г. Полацка |

## ЗМЕСТ

Прадмова

### ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ – 80 ГОД

*Юрчак Д.В.* Административно-территориальное деление современной Витебской области: историческая ретроспектива . . . . . . . . . . . 4

*Иванова Т.П.* Витебский регион в 1917–1924 гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .15

*Бараноўскі А.В.* Падзел Сенненскага павета паміж Аршанскім, Бачэйкаўскім і Віцебскім паветамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .19

*Жуковский В.В.* Краткая история административно-территориального деления Оршанщины . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .23

### ГІСТАРЫЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА

*Андрэйчык К.В.* Добраўпарадкаванне нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей г. Віцебска і Віцебскай вобласці ў 1991–2001 гг.: планаванне і мерапрыемствы мясцовых улад . . . . . .26

*Бондарева Е.М.* Здание бывшего Крестьянского поземельного банка в г. Витебске и его обитатели. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .31

*Гайдукоў К.П.* З досведу даследавання тэмы «Героі Сацыялістычнай Працы – ураджэнцы Віцебскай вобласці» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .36

*Гончарова И.В., Пирогова О.В.* Отчеты как источник информации по истории Витебского края начала ХХ в. (из фонда Центральной научной библиотеки Национальной академии наук Беларуси) . . . . . .44

*Денисова И.В.* Историко-педагогические источники истории музыкального образования Витебской губернии (вторая половина ХІХ – начало ХХ в.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .47

*Иванова Т.П.* Из истории издания «Полоцких епархиальных ведомостей» . . .51

*Карпекін К.Р.* Яўрэйскія малітоўныя дамы мястэчка Астроўна ў 1918 – пачатку 1930-х гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .53

*Леоненко С.П.* Петр І в Бешенковичах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .58

*Лещинский М.А.* История возведения памятника Александру Казарскому в Севастополе по документам российских архивов . . . . . . . . . . .62

*Макараў М.Д.* Пра пачаткі ансамбля Ратушнай плошчы ў Віцебску . . . . . . .70

*Мандрык І.У.* Развіццё прамысловага комплексу Беларусі з улікам новых падыходаў да эканомікі ў 1966–1970 гг. (на прыкладзе Віцебскай вобласці) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .74

*Мартинович С.В.* К истории строительства киностудии в Витебске (1929–1933 гг.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .82

*Мізярска Н.А.* Шляхецкія маёнткі Лепельскага павета Віцебскай губерні (XVIII – пачатак ХІХ ст.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .88

*Николаева И.В.* Организационное строительство и развитие военных комиссариатов на Витебщине в 1918–1941 гг. . . . . . . . . . .92

*Новак Г.Г.* История Витебской очковой фабрики . . . . . . . . . . . . . . . .97
*Півавар М.В.* Краязнаўчы атлас Віцебскага раёна . . . . . . . . . . . . . . . 102
*Соловьянов А.П.* Проблема беспризорности на Витебщине в 1920-е гг. . . . . 107
*Стук П.С., Тетерев В.А.* Белорусизация на Витебщине
на страницах местных газет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 112
*Сцебурака А.М.* Віцебшчына ў праекце перавыдання
«Напалеонаўскага гіда» Алена Шапэ: вопыт удзелу
ў складанні даведніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 120
*Тимофеев Р.В.* Развитие транспорта в Витебской области
в послевоенный период . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123
*Трусова Е.Г., Лисов А.Г.* Журнал «Витебский край» (1917 г.):
страницы издания как зеркало исторических судеб региона . . . . . . 126
*Федотова-Шнер Н.О.* История поселка на берегу Двины . . . . . . . . . . . . 136
*Чараўко В.У.* Пачатак вывучэння познесярэдневяковых пахавальных
помнікаў Падзвіння ў кантэксце агульнага развіцця
археалагічных ведаў на Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 141
*Юпатов А.Н.* Пожарная охрана Витебской губернии в 1917–1924 гг. . . . . . 146
*Юпатов А.Н.* Культурно-просветительная жизнь Сенненщины
в начале 20-х годов прошлого века . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 151
*Янкул А.Н.* «Памятная книжка Харьковской губернии» (1862–1868 гг.)
как источник по изучению края . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 156

**КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫЯ ЎСТАНОВЫ І ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ
Ў СІСТЭМЕ СУЧАСНАГА КРАЯЗНАЎСТВА**

*Арлова А.Г.* Даследчая дзейнасць Бешанковіцкай сярэдняй школы
ў кірунку праваслаўнага краязнаўства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 161
*Барановский А.Л.* Учитель! Перед именем твоим… Геннадий
Брониславович Шешкен (1925–2013): материалы к биографии . . . . . 165
*Воднева И.П.* Направления и формы работы по нравственно-
патриотическому воспитанию подрастающего поколения
(из опыта работы Краеведческого музея Полоцка) . . . . . . . . . . . . 172
*Давидовская О.Н.* Витебск 1920-х – 1930-х гг. на фотографиях
из фондов областного краеведческого музея . . . . . . . . . . . . . . . . 176
*Ермалёнак В.А.* Амулеты, абярэгі і лекавыя сродкі
ў музеях СШ № 3 г. Мёры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 182
*Кепин Д.В., Титова Е.Н.* Перспективы развития «Археопарка»
в селе Пересопница Ровенской области . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 188
*Лукьянова В.А.* Особенности молодежной субкультуры стиляг
(на примере Витебска) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 193
*Мухина Н.А.* Краеведческие проекты публичных библиотек
Городокского района: опыт и достижения . . . . . . . . . . . . . . . . . . 195
*Наумова Н.М.* Анна Болеславовна Миссуна и ее последователи . . . . . . . . 202
*Никитин С.П.* Герой Австрийского фронта Орлов Георгий Иванович . . . . 208

*Нікіціна Л.К.* Сям'я Кузьміных з в. Машкіна Заронаўскага сельсавета – Праведнікі народаў свету . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 212
*Рябушко М.В.* Реализация структурно-функциональной модели туристской и краеведческой работы «Через познание малой родины к истокам патриотизма и гражданственности» в Государственном учреждении образования «Витебский городской центр дополнительного образования детей и молодежи» . . . . . . . . . . . 216
*Смирнова Т.Р.* Вопросы нравственно-патриотического воспитания личности ребенка на современном этапе (на примере сотрудничества Детского музея и Учреждения дошкольного образования № 29 г. Полоцка) . . . . . . 221
*Струнчанка А.А.* Роля ўстаноў культуры ў захаванні і папулярызацыі традыцыйнай культуры Віцебшчыны . . . . . . . . 226
*Ўлiновіч Н.В.* Выяўленне і збераджэнне аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны: праблемы і шляхі вырашэння, перспектывы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 228
*Шишанов В.А.* Художественно-археологическая выставка 1871 г. в Витебске: к вопросу о проведении и составе экспонатов . . . . . . . 231
*Ястремский П.Г.* Краеведение и военно-патриотическое воспитание в учебном процессе среди подростковой молодежи на примере зимних боев 1943–1944 гг. на территории Витебской области . . . . . 238

## ЛІТАРАТУРНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА. МОВАЗНАЎСТВА. ЭТНАГРАФІЯ. ФАЛЬКЛОР

*Аляксеева Т.У.* Выхаваўчы патэнцыял драматургіі Віцебскага рэгіёна . . . . 243
*Бароўка В.Ю.* Віцебшчына ў экфрасісах беларускіх паэтаў другой паловы XX – пачатку XXI ст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 248
*Гладкова Г.А.* Літва і Белая Русь на старонках рамана Ф.А. Асяндоўскага «Царскі трубач» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 253
*Дадэркіна Ж.В.* Дыялектызмы ў лексічнай структуры аповесці «Удог» Ф. Сіўко . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 257
*Дубоўская Т.А.* Наватарства Вацлава Ластоўскага ў галіне формы верша: ацэнкі айчынных літаратуразнаўцаў . . . . . . . . . . 263
*Дулова Ю.В.* Реализация растительного кода культуры в артионимии Белорусского Поозерья . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 268
*Казлова А.У.* Літаратурная старонка газеты «Чырвоная Полаччына» як люстэрка літаратурнага жыцця рэгіёна ў 1926–1928 гг. . . . . . . . 271
*Лисов А.Г.* Организации эсперантистов в г. Витебске в 1910–1920-х гг. . . . . 276
*Мартинович С.В.* Девичья коса в народном свадебном обряде Витебщины . 280
*Навасельцава Г.В.* Жанрава-стылёвая адметнасць рамана Міколы Аўрамчыка «У падзямеллі» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 285
*Налётава Н.М.* Мастацкая рэпрэзентацыя асобы і дзейнасці Ф. Скарыны ў прозе Алега Лойкі . . . . . . . . . . . . 287

*Подлипский А.М.* Издание учебной литературы в Витебске доктябрьского периода . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 292
*Русецкий А.В., Русецкий Ю.А.* Известный советский пушкинист Борис Мейлах. А он-то из Лепеля . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 297
*Саматой І.В.* «Жыцця майго і смерці пераправы» (ваенная лірыка Анатоля Вялюгіна) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 305
*Тачыла Н.Р.* Спосабы ўтварэння адэтнанімічных антрапонімаў . . . . . . . 309
Дадаткі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 315
Звесткі пра аўтараў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 340

Навуковае выданне

# ВІЦЕБСКІ КРАЙ

Т. 4

Матэрыялы IV Міжнароднай навукова-практычнай
канферэнцыі «Віцебскі край»,
прысвечанай 80-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці

22 лістапада 2018 г., Віцебск

Рэдактары Н. В. Анапрэенка, А. М. Галіноўская, Г. А. Суша
Дызайн вокладкі К. В. Стральцовай
Камп’ютарная вёрстка Д. В. Макарэвіча

Падпісана ў друк 01.08.2019. Фармат 80х64 1/16. Гарнітура Times New Roman.
Лічбавы друк. Умоўн. друк. арк. 20,23. Улік. выд. арк. 20,02. Тыраж 41 экз. Заказ 884.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворца, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/398 ад 02.07.2014.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворца, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 2/157 ад 02.07.2014.

Пр. Незалежнасці, 116, 220114, Мінск.
Тэл. (+375 17) 293 27 68. Факс (+375 17) 266 37 23. E-mail: edit@nlb.by.